20.01.2021 / 12:04

Гарадзенку затрымалі за штаны з бела-чырвонымі лампасамі, бо яны «парушаюць грамадскі парадак»

Любоў Сарлай — мама ў дэкрэце. У нядзелю яна выйшла прагуляцца па Гродне. Надзела цёплыя штаны з бела-чырвонымі лампасамі, узяла каву, разгаварылася па дарозе з жанчынай. Яны ўдзвюх ішлі ў бок Моладзевага цэнтра, калі ззаду падбег АМАП і папрасіў прайсці ў бус.



Фота зроблена за некалькі хвілін да затрымання

«У пратаколе напісалі, што я ўдзельнічала ў пікеце, крычала «Жыве Беларусь». Але міліцыянт ад рукі яшчэ складаў тлумачальную — там было пра колер штаноў, які парушае грамадскі парадак. Я здзівілася: што, такое цяпер у дакументах пішуць?» — расказвае жанчына.

Ноч яна са знаёмай правяла ў ІЧУ. Суд па скайпе адбыўся ў панядзелак.

«Суддзя цікавіўся маім адзеннем. Пытаўся, якога колеру на мне была куртка, якога колеру шарф. На штанах — гэта заводскі малюнак. Я казала: можаце ўзяць і паглядзець, што лампасы я

не сама нашывала. Штаны ў мяне з 2014 года, я ў іх яшчэ цяжарная хадзіла, раней пытанняў не было. Яны якраз для халадоў».

У Любові двое малых дзяцей — 2 і 6 гадоў, таму суткі ёй даць нельга. Суддзя Руслан Гурын выпісаў штраф у 20 базавых (580 рублёў). Тое ж прысудзілі і жанчыне, якую затрымалі разам з Любоўю. Штаны не канфіскоўвалі.

Гарадзенку, дарэчы, судзілі не ў першы раз. Было пасяджэнне пасля затрымання ў кастрычніку, а таксама праз фота ў інстаграм. Але ў абодвух выпадках суд жанчыну апраўдаў.

НЛ

ЧЫТАЙЦЕ ЯШЧЭ

«Убачыў запусценне. Людзей амаль няма, усё зачынена». Якой пабачыў Беларусь палітвязень пасля выхаду з калоніі

Выйшаў на волю палітвязень Дзмітрый Абрамук

«Дэмакратычны свет зможа дапамагчы нам толькі тады, калі пабачыць, што гэта патрэбна нам самім». У Вільні прайшоў Чарнобыльскі шлях

Пратасевіч просіць літасці / Удава Макея абураная / Шпіц Лукашэнкі лётае на верталёце. Глядзіце ВІДЭАнавіны за 26 красавіка